


# Першыя Шчорсаўскія чытанні

*Напрыканцы мая адбыліся Першыя Шчорсаўскія чытанні. Іх тэма – «Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне. Дзяржаўныя і прыватныя зборы». Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, Навагрудскі раённы выканаўчы камітэт, Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Навагрудская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма.*

Ідэя правядзення чытанняў у Шчорсах была выкліканая абвяшчэннем ў Беларусі Года кнігі і тым, што горад ў XVIII–XIX стагоддзях быў сапраўдным культурным цэнтрам са знакамітай на абшарах Вялікага Княства Літоўскага бібліятэкай, дзе ў розныя часы захоўвалася ад 9 да 20 тысячаў кніг, манускрыптаў, рукапісаў, картаў. Мелася калекцыя археалагічных знаходак, калекцыя карцінаў. Сам маёнтак прываблівае дасканалымі архітэктурнымі формамі, прыгожым пейзажным паркам і ўнікальнай аранжарэяй. Ды і сёння Шчорсы – гэта маляўнічы, прыгожы куток, дзе пануе дух шляхетнасці і інтэлігентнасці, дзе моцная гаспадарка і гасцінныя людзі, якія для ўдзельнікаў чытанняў стварылі атмасферу свята.

У Шчорсаўскіх чытаннях прымалі ўдзел прадстаўнікі ўлады, супрацоўнікі бібліятэк, музеяў, настаўнікі, выкладчыкі вышэйшых і сярэдне-спецыяльных установаў адукацыі, грамадскасць горада.

Навуковыя супрацоўнікі з Гродна і Мінска падзяліліся з прысутнымі грунтоўнымі даследаваннямі. Увага выступоўцаў акцэнтавалася на ролі Іахіма Храптовіча ў асветніцкіх працэсах і сацыяльна-гаспадарчых увядзеннях у маёнтку Шчорсы. Гаворка ішла аб першых медыцынскіх бібліятэках на Гродзеншчыне і першай публічнай бібліятэцы ў Навагрудку, што размяшчалася ў будынку былой Дамініканскай школы. Цікавымі атрымаліся даклады аб ланкастарскіх школах (адна з іх працавала і ў Шчорсах), аб фондах роду Сапегаў, першых газетах Навагрудчыны, выданнях Гродзенскай губернскай друкарні, што захоўваюцца ў фондах абласной навуковай бібліятэкі.

Пад час чытанняў працавала выстаўка народнага мастацтва «Творчасць маіх землякоў». Прыцягвала ўвагу прысутных галерэя інтэлектуальнай спадчыны «Шчорсаўскія скарбы», дзе дэманстраваліся кніжныя, часопісныя выданні, фотаздымкі прысвечаныя гісторыі Шчорсаў. Прадстаўленыя выдавецкія працы Навагрудскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы дазволілі пазнаёміцца з арыгінальным падыходам да збору матэрыялаў па краязнаўстве, іх групоўцы і выкарыстанні бібліяграфічнай прадукцыі для папулярызацыі свайго раёна.

Дырэктар Гродзенскай абласной бібліятэкі Лідзія Мальцава адзначыла важнасць «Шчорсаўскіх чытанняў» у культурным жыцці Гродзеншчыны. Менавіта праз такія праекты бібліятэкі могуць шырока рэкламаваць сваю дзейнасць, пашыраць фонды каштоўнай літаратурай. А дырэктар Беластоцкай ваяводскай бібліятэкі Ян Леанчук выказаў надзею, што фонды буйных бібліятэк Беларусі, Літвы і Польшчы стануць даступнымі любому жыхару нашых краінаў нягледзячы на межы. Самі ж чытанні плануецца праводзіць раз на два гады.

*Ірына ЦАРУК,*
*намеснік дырэктара*
*Навагрудскай ЦБС*